**34.** Складзіце тэкст-апавяданне, тэкст-апісанне і тэкст-разважанне, якія пачыналіся б з прапанаваных фраз.

1. Жылі-былі сябры, якія вельмі любілі падарожнічаць аўтастопам.

2. Прадаецца камп’ютар, які быў у карыстанні.

3. Народная мудрасць сцвярджае: «Чаго сабе не жадаеш, таго і іншым не зыч».

**35.** Разгледзьце малюнкі. Тэкст якога тыпу маўлення можна скласці на іх аснове? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

Складзіце выказванне адпаведнага тыпу маўлення на аснове малюнкаў.




**36.** Прачытайце. Тэксту якога тыпу маўлення адпавядаюць прыведзеныя пачатак і канцоўка? Пра што можа быць тэкст?

«Песня — душа народа», — сказаў збіральнік і прапагандыст беларускай народнай песні Рыгор Шырма.

...

Песня — гэта залатая скарбніца беларускай народнай культуры.

Складзіце тую частку тэксту, якой не хапае. Запішыце тэкст.



Правообладатель Национальный институт образования

**37.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Якія тыпы маўлення спалучаюцца ў ім? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

На працягу шматлікіх стагоддзяў беларусы трапятліва ставіліся да мудрасці і імкнуліся да пазнання. З ранніх часоў, калі многае вырашалася мячом і крывёй, людзі разумелі, што самая вялікая сіла — у ведах. Яркім прыкладам гэтаму стала Ефрасіння (Еўфрасіння) Полацкая, якая прысвяціла сваё жыццё служэнню Богу і асвеце людзей. Яе розум і пісьменнасць[с] былі ўнікальнымі для таго часу (у XII стагоддзі жанчыны былі пазбаўлены магчымасці атрымаць адукацыю).

Шляхетная князёўна была ўнучкай полацкага князя Усяслава Чарадзея[ф]. Магчымасць падарожнічаць дала яму веды і мудрасць, з якімі ён выхоўваў сваю ўнучку. У рукапісах ёсць сведчанні, што Ефрасіння, ці Прадслава, ужо ў юным узросце адрознівалася ад сваіх аднагодак жывым розумам і далікатным характарам. Калі бацькі вырашылі выдаць яе замуж, яна збегла ў манастыр, у Сафійскі сабор, што знаходзіцца ў Полацку. Прыняўшы пострыг і атрымаўшы імя Ефрасіння, яна цалкам прысвяціла сябе кнігам.

Заснаваны ёю жаночы манастыр стаў месцам, дзе манашкі займаліся іканапісам[сл], ткалі, навучаліся чытанню і пісьму, вялі летапісы. Паступова манастыр стаў цэнтрам адукацыі для ўсіх зямель Заходняй Русі. У сценах сабора захоўваліся зборы твораў славутых асветнікаў Кірыла і Мяфодзія, прапаведніка хрысціянства Іаана Залатавуста, «Аповесць мінулых гадоў».

Ефрасінняй уручную былі перапісаны не толькі царкоўныя кнігі, але і зборнікі афарызмаў, хронікі. Яна пісала і ўласныя працы — малітвы і павучанні, займалася перакладамі з лацінскай і грэчаскай моў.

У 1999 годзе ў Мінску каля Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта быў устаноўлены помнік Ефрасінні Полацкай, створаны таленавітым скульптарам Ігарам Голубевым *(Паводле матэрыялаў сайта www.vetliva.by)*.

У чым унікальнасць асобы Ефрасінні Полацкай?

Дакажыце, што заснаваны Ефрасінняй манастыр стаў цэнтрам адукацыі ў Заходняй Русі.

Разгледзьце фотаздымак помніка на вокладцы вучэбнага дапаможніка. Раскажыце, якой паказаў скульптар беларускую асветніцу. Як вы думаеце, чаму яна трымае ў руках пяро і кнігу? Спалучыце ў сваім адказе элементы апісання і разважання.



Правообладатель Национальный институт образования